*Клімуць Л.Я.*

# *МАДЭРН У АРХІТЭКТУРЫ МАГІЛЕВА*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Незвычайнасць мадэрна ў тым, што ён не мае такіх выразных межаў, як іншыя мастацкія стылі. Безумоўна, ён мае сваю перыядызацыю і свае

характэрныя рысы, якія дазваляюць нам аднесці той ці іншы помнік да мадэрну.

Але ўсё ж мадэрн вырастае неўпрыкмет з папярэдніх стыляў і пазней плаўна пераходзіць у стылі наступныя. Па сутнасці, ён і ўяўляецца хутчэй звязуючым звяном паміж мастацтвам 19 і 20 стагоддзяў, чым асобным перыядам у гісторыі мастацтва. Можна сказаць, што мадэрн паставіў мэту знайсці новы стыль, накіраваны на стварэнне прыгожага, якога няма ў рэальным жыцці.

Настроі fin de siecle дыктавалі формы гэтага мастацтва. Няпэўнасць і няяснасць у спалучэнні з увагай да камфортнасці і практычнасці, настойлівае імкненне стварыць не проста дэкор, а новае атачэнне для пражывання чалавека, у рэшце рэшт, ідэя сінтэзу мастацтваў - усе гэта адпавядала таму раздарожжу, на якім непазбежна аказваецца чалавецтва на мяжы стагоддзяў.

Прадстаўнікі мадэрну ў сваіх творах аб'ядноўвалі рамантыку гістарычных стыляў і сучасныя матэрыялы і канструкцыі. Яны марылі прымірыць прыгажосць і неабходнасць. Яны ўсклалі на сябе місію вывесці мастацтва з крызісу 19 стагоддзя і ўвогуле пракласці шлях з мінулага стагоддзя ў будучае.

Аднак мадэрн па-рознаму праявіў сябе ў розных краінах і нават меў розныя назвы, але нідзе не стаў дзяржаўным стылем. Своеасаблівае ўспрыняцце і перапрацоўка гэтага стылявога напрамку характэрна і для беларускай архітэктуры.

Мадэрн у сваім чыстым выглядзе не атрымаў у Беларусі шырокай папулярнасці; тут не было такіх цэнтраў, як у Маскве, ў Расіі, напрыклад. Але пакідаць яго па-за ўвагай таксама было б няправільна.

Уважліва разглядаючы архітэктурныя помнікі Магілёва пачатку 20 стагоддзя, няцяжка зразумець, чаму мы можам гаварыць толькі пра элементы мадэрну ў будынках нашага горада.

Паспрабуем прааналізаваць некаторыя з іх.

Адзін з прыкладаў архітэктуры, які мае выразны ўплыў мадэрну, - будынак Магілёўскага педагагічнага інстытута на вул.Ленінскай (раней даходны дом). Як ужо ясна з вышэйсказанага, гэта не помнік аднаго чыстага стылю; наадварот, у ім спалучаны класіцызм, псеўдарускі стыль і мадэрн.

Плaніроўка будынка звычайная, калідорная, з двухбаковым размяшчэннем памяшканняў. Новае з'яўляецца ў афармленні фасада, а менавіта ў спробе надаць новае дэкаратыўнае і вобразнае асэнсаванне канструктыўным элементам будынка.

Фасад выразна падзелены на тры часткі па гарызанталі. Кожны ярус аздоблены пілястрамі. Але гэтыя вертыкальныя чляненні не толькі даніна класічнай традыцыі, яны дапамагаюць стварыць эфекты светлаценю на плоскасці сцяны. Гэта адзін з прынцыпаў мастацкай сістэмы мадэрну, для якога фасад - не проста каменная маса, упрыгожаная дэкаратыўнымі дэталямі, а пластычная каштоўнасць, сродак для ўвасаблення мастацкага вобраза.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Наўкруглыя арачныя вокны другога паверху, безумоўна, узяты з арсеналу рускага стылю. Аднак геаметрычны арнамёнт архівольтаў надае ім іншы сэнс. Спалучэнне прамавугольных і круглых ліній надзвычай характэрна і важна для мадэрну. Але тут аўтар нібыта спыняецца, не развіўшы ідэю і абмежаваўшыся простым размяшчэннем побач розных па малюнку элементаў.

Трэці паверх асабліва цікавы арнаментальным узорам. Ён увогуле вылучаецца ў будынку большай дробнасцю дэталяў у параўнанні з двума ніжнімі. Калі пры афармленні ніжніх паверхаў аўтар выразна імкнуўся захаваць класічную аснову, то пры дэкарацыі трэцяга паверху яна яўна парушана. Гэтаму садзейнічае і дробнасць архітэктурных дэталяў, і выкарыстанне арнаменту ў якасці асноўнай дзкарацыі, які ўяўляе сабою геаметрычную стылізацыю раслінных матываў.

Асабліва прыкмячальна акцэнтаваны ўваходы: балкон на другім і трэцім паверхах з ажурнымі рашоткамі і паўцыркульныя франтоны з рэльефнай паверхняй. Такое афармленне яскрава паказвае адмаўленне ад класічнай традыцыі, перш за ўсё ў новым выкарыстанні балконаў, моцна высунутых уперад. Характэрна ў такім разе і адмаўленне ад гладкай абліцоўкі сцяны.

У той жа час ясна выяўленая структура пабудовы і падкрэсленая тэктанічнасць не супярэчаць прынцыпам мадэрну. Гэтыя якасці асабліва пачынаюць займаць архітэктараў у пачатку 20 стагоддзя - перыяд, які лічыцца пачаткам функцыяналізму.

На прыкладзе будынка Магілёўскага педінстытута відавочна, што ідэі мадэрну ў спалучэнні са стылізаванай арнаментыкай рускага стылю ствараюць новы мастацкі вобраз, які немагчыма ўключыць ні ў адзін з існуючых гістарычных стыляў.

Будынак пазямельна-сялянскага банка (цяпер Мастацкі музей) на першы погляд не нагадвае пра мадэрн. Аднак на самой справе гэта не так.

Асіметрычная разбіўка двухпавярховай пабудовы цалкам адпавядае сістэме мадэрну. Разнастайна аформленыя часткі фасада і іх завяршэнні наўмысна падкрэсліваць гэту асіметрычнасць, прапагандуючы адну з галоўных ідэй мадэрну. Імкненне да жывапіснасці і дэкаратыўнасці ў выкарыстанні дэталяў псеўдарускага стылю ў арнаментыцы.

Асаблівую цікавасць выклінае той факт, што ў класічную схему з вылучанай цэнтральнаи часткай, якая панавала ў архітэктуры 19 стагоддзя, уведзена асіметрыя, чым поўнасцю парушага гэтая самая схема.

Архітэктура жылых дамоў мае больш практычную накіраванасць. У ей няма буйства форм, характэрнага для багатых сядзіб, аднак менавіта ў жылой архітэктуры пазней нарадзіцца новы стыль - канструктывізм. Але яго мы пакінем па-за ўвагай.

Дом па вул.Ленінскай, 34 - найбольш яскравы прыклад мадэрну ў архітэктуры Магілёва. Тыповае для гэтага напрамку афармленне вокнаў - прамавугольных са скругленнымі вугламі і арачных. Спалучэнне розных форм

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

у адным будынку надае яму асаблівую выразнасць. Мадэрн увогуле мог культываваць формы да бясконцасці.

Акруглыя лініі вокнаў і фрыза надаюць класічнасць сцяне. Цякучы рытм і асіметрыя прываблiваюць гледача, ствараюць цалкам новы пластычны вобраз, па духу свайму непадобны на ўсё, што стварыла гарадская архітэктура 19 стагоддзя.

Асабліва цікавы рызаліт будынка, які завяршаецца аттыкам і несапраўдным шчытом складанай канфігурацыі. Рызаліт неглыбокі. Гэта плоскаснасць у афармленні сцяны і графічны дэкор надаюць вобразу асаблівую вытанчаннасць. А ў вобразе гэтым, безумоўна, прысутнічае ад чароўнасці мадэрну.

Дом па вул. Ленінскай, 40 не з'яўляецца помнікам мадэрну ў чыстым выглядзе. Гэта сумесь позняга класіцызму і мадэрну. Тут выкарыстаны набор класічных дэталяў: пілястры, антаблемент, скульптурныя вянкі, гермы. Аднак дробнасць фасада, яго складаны прасторавы рэльеф, багацце дэкору звязаны са стылістыкай мадэрну. І хаця вялікая колькасць дэкарацый можа нагадаць нам пра ракако, аднак хутчэй гэта буйства, ўпрыгожванняў прадыктавана дэкаратыўнымі памкненнямі мадэрну.

На суб"ектыўную думку, папярэдні будынак выйграе дзякуючы чысціні ліній.

Такім чынам, беларускі мадэрн моцна звязаны з гістарычнымі стылямі. Ен вырастае з іх і ў той жа час дае ім новы штуршок для развіцця. У гэтым няма нічога дзіўнага.

Мадэрн сам па сабе быў стылем рамантычным, ідэальна-узвышанным. Гэта відаць ужо па тых глабальных задачах, па перабудове ўсяго мастацкага жыцця, якія ён ставіў перад сабой. Аднак простаму пераймannю асобных дэталяў, чым займаліся гістарычныя стылі, мадэрн супрацьпаставіў творчасць, стварэнне новага мастацкага вобраза. У гэтым творчым працэсе знаходзяць сваё месца і гарманічна суіснуюць розныя архітэктурныя плыні.

У той на час мастацкая мова, якую стварыў мадэрн, выкарыстоўвалася стылямі іншых ідэйных накірункаў.

Аднак неабходна адзначыць, што ў беларускай архітэктуры мадэрн сустракаецца хутчэй у выглядзе асобных дэталяў, як частка мастацкага вобраза, а не яго аснова, як гэта было ў Заходняй Еўропе.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова